**Урок 22, дата______ ЛІТАРАТУРНАЕ ЧЫТАННЕ 4 КЛАС**

**ТЭМА: Канстанцыя Буйло «Люблю»**

**МЭТЫ :**Фарміраваць навык правільнага чытання і вымаўлення гукаў па беларуску.

Актывізаваць эмацыянальную сферу вучняў.

Развіваць уменне выбарачнага і выразнага чытання.

Развіваць чытацкія ўменні знаходзіць у паэтычным творы мастацкія словы і выразы, тлумачыць іх значэнне.

Фарміраваць уменне вызначаць аўтарскія адносіны да радзімы і вучнёўскія — да лірычнага твора.

Вучыць вызначаць націскныя словы, правільна расстаўляць паўзы, падбіраць патрэбную інтанацыю.

Адзначыць любоў паэтэсы да роднай старонкі і беларускага народа, засяродзіць увагу на адлюстраванне ёю прыгажосці прыроды ва ўсе поры года і беларускай песні, на песеннасць верша.

## ХОД УРОКА

## І.АРГАНІЗАЦЫЙНЫ МОМАНТ

## ІІ. ПРАВЕРКА ДАМАШНЯГА ЗАДАННЯ

1. Успомніце, у якім стагоддзі пачалі будавацца старажытны Камянец і вежа:
а) у IX ст.; б) у XIII ст.; в) у XVI ст.; г) у XVIII ст.
2. Раскажыце гісторыю пра паходжанне назвы Камянец, якую апавядае пісьменнік.
3. Як выглядае Камянецкая вежа? Знайдзіце і прачытайце яе апісанне.
4. Разгледзьце фотаздымак (с. 69). Ці адрозніваецца апісанне помніка ад яго рэальнай выявы?
5. Як ставіцца Алесь Каско да помніка? (З расчараваннем, захапленнем, здзіўленнем, цікавасцю.)
6. Чаму Камянецкую вежу яшчэ называюць Белай? Як Уладзімір Караткевіч тлумачыць такое паходжанне назвы?

## ІІІ.УВЯДЗЕННЕ Ў ТЭМУ

**-** Паслухайце песню «Люблю наш край».

- Ці спадабалася яна вам? Падзяліцеся сваімі ўражаннямі.

## ІУ.РАБОТА З ВЕРШАМ

с. 75 – 77

**1. Прагназаванне зместу верша «Люблю»** па загалоўку (рубрыка «Пафантазіруйце»).

- Прачытайце загаловак верша.
- Аб чым можа ісці гаворка ў творы? Паразважайце.

**2. Слуханне верша, вызначэнне яго першаснага ўспрымання і эмацыянальнага настрою**.

**3. Чытанне твора вучнямі сам сабе, уголас па страфах.**

Вызначэнне вобразных слоў і выразаў, тэмы і асноўнай думкі верша, аўтарскіх і ўласных адносін да Радзімы.

**4. Гутарка па змесце**

- Якія пачуцці перадаюцца ў вершы?
- За што паэтэса любіць родны край? Пералічыце.
- Патлумачце, як вы разумееце сэнс выразаў:

- Слязу нядолі праліла;

- Залочаныя збожжам нівы;
- Люблю зіму з яе марозам, Што вокны прыбярэ ва ўзор;
- І белы снег, што, укрыўшы поле, Ірдзіцца бляскам ясных зор.

- Якое слова і дзеля чаго паўтараецца амаль у кожным чатырохрадкоўі гэтага верша?
- Чаму Канстанцыя Буйло любіць усе прыродныя з'явы і поры года? Як гэта характарызуе паэтэсу?
- Верш «Люблю» напісаны ў 1913 годзе, больш за сто гадоў таму назад. Якія радкі сведчаць пра даўно мінулы час?

**5.Адпрацоўка ўмення вызначаць мэту выразнага чытання**
(што трэба перадаць слухачам пры чытанні), выбар тону ў адпаведнасці з эмацыянальным станам дзейнай асобы, выдзяленне з дапамогай лагічнага націску важных слоў, паўз.

**У. ПАДВЯДЗЕННЕ ВЫНІКАЎ**

**Люблю**

Люблю Радзіму дарагую,
Лясы, прасторы і палі.
Бо я ніколі не забуду,
Свой родны край, сваёй зямлі.

Я тут убачыў шмат дзівосаў,
Цудоўных песень шмат пачуў,
І ласку матчыну з калыскі
З маленства сэрцам я адчуў.

**УІ.РЭФЛЕКСІЯ**

Я навучыўся….
Сення на ўроку я адчуў гонар за…..

**УІІ.ДАМАШНЯЕ ЗАДАННЕ:**

*выразна чытаць верш К.Буйло "Люблю".*